# Урок 78

У Сашы было 4 р., а ў Пашы — 3 р. 20 к. На гэтыя грошы хлопчыкі купілі 9 паштовак з мадэлямі машын па адной цане. Колькі паштовак купіў Саша? Колькі паштовак купіў Паша?



4 р. і 3 р. 20 к.



1. Спачатку даведаюся, колькі ўсяго грошай было ў хлопчыкаў.
2. Потым даведаюся цану паштоўкі.
3. Цяпер даведаюся, колькі паштовак купіў кожны хлопчык.

**1.** Турысты прайшлі 25 км за першы дзень і 15 км за другі дзень паходу. Увесь шлях заняў 8 г. Колькі гадзін турысты былі ў дарозе ў першы дзень і ў другі дзень, калі скорасць іх руху была аднолькавая?

| Скорасць, км/г | Час, г | Адлегласць, км |
|---|---|---|
| аднолькавая | ? } 8 | 25 |
| | ? | 15 |



25 км і 15 км

**2.** Вылічы.

35 700 · 2 + 37 500

1 000 000 – 44 480 · 6

149 715 : 5 – 9954

(748 204 + 235 730) : 3



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 78



**3.** Устаў прапушчаныя лікі.

$4$ м$^2$ $8$ дм$^2$ = ? дм$^2$
$5$ м$^2$ $75$ см$^2$ = ? см$^2$
$8$ га $88$ м$^2$ = ? м$^2$

$16$ м$^2$ $6$ дм$^2$ = ? дм$^2$
$30$ м$^2$ $7$ см$^2$ = ? см$^2$
$10$ га $2$ м$^2$ = ? м$^2$

**4.** У трох дамах жывуць 4200 чалавек. У першым доме жыве $\frac{1}{3}$ частка ўсіх жыхароў, у трэцім доме — на 150 чалавек менш, чым у першым. Колькі чалавек жывуць у другім доме?

**5.** Перыметр пяцівугольніка — 60 см. Даўжыня адной з яго старон роўная пятай частцы перыметра. Знайдзі суму даўжынь астатніх старон пяцівугольніка.

Ці могуць усе стораны гэтага пяцівугольніка мець аднолькавую даўжыню?



**6.** Пабудуй у сшытку дыяграму, на якой будзе паказана, што прывезлі 2 ц морквы, бульбы — у 2 разы больш, чым морквы, а цыбулі — столькі, колькі морквы і бульбы разам.

**?** Купілі 5 ручак чырвонага і сіняга колераў па аднолькавай цане. За чырвоныя ручкі заплацілі 2 р., а за сінія — 3 р. Колькі ручак кожнага колеру купілі?

**1.** Вылічы.

$56\,736 : 6 \cdot 9$

$480\,001 - 98\,685 : 5 + 7003$

**2.** Клава і Слава купілі 7 аднолькавых набораў каляровай паперы. Ва ўсіх наборах у Клавы было 48 лістоў паперы, а ў Славы — 36 лістоў. Колькі набораў каляровай паперы купіла Клава? Колькі купіў Слава?



Правообладатель Национальный институт образования